**З. У. Шведава, А. М. Палуян**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА І ЯЕ РОЛЯ Ў ВЫЗНАЧЭННІ ПРАФЕСІЙНАЙ ПРЫГОДНАСЦІ СТУДЭНТА

Пераддыпломная практыка – абавязковы кампанент у атрыманні вышэйшай адукацыі, які забяспечвае станаўленне прафесійнай кампетэнтнасці для далейшай самастойнай дзейнасці ў абранай галіне.

Пераддыпломнай практыкай для студэнтаў-філолагаў спецыяльнасці «Беларуская філалогія» з'яўляецца педагагічная практыка ва ўстанове сярэдняй адукацыі, у мэту якой уваходзіць:

− азнаямленне з вучэбнай і выхаваўчай працай установы адукацыі;

− назіранне за вучэбным калектывам, вывучэнне асобы навучэнца;

− правядзенне вучэбнай працы ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры;

− правядзенне выхаваўчай і культурна-творчай працы ў якасці класнага кіраўніка;

− правядзенне навукова-даследчай працы па псіхолага-педагагічных праблемах;

− удзел у метадычнай працы ўстановы адукацыі;

− ацэнка прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, набытых пад час праходжання педагагічнай практыкі.

Пастаўленая мэта прадугледжвае вырашэнне наступных *задач*:

− азнаямленне з вучэбна-выхаваўчай работай школы: размовы з кіраўніком навучальнай установы, намеснікам дырэктара па навучальнай і выхаваўчай рабоце, класнымі кіраўнікамі, настаўнікамі-прадметнікамі;

− правядзенне вучэбнай работы ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры: азнаямленне з каляндарна-тэматычным планам настаўніка; наведванне і аналіз урокаў настаўніка-прадметніка; распрацоўка канспектаў урокаў, падбор дыдактычнага матэрыялу, падрыхтоўка наглядных дапаможнікаў да ўрокаў; правядзенне і аналіз пробных і заліковых урокаў па прадмеце; праверка і аналіз самастойных работ, сшыткаў навучэнцаў; наведванне і аналіз урокаў, якія праводзяць студэнты; вывучэнне навучальных і метадычных дапаможнікаў, дадатковай літаратуры; правядзенне пазакласнай работы па прадмеце.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– правядзенне выхаваўчай і культурна-творчай работы з навучэнцамі ў якасці класнага кіраўніка: вечарын адпачынку, конкурсна-забаўляльных і гульнёвых праграм, капуснікаў, гумарын, дыскатэк, святаў і г. д. Наведванне і аналіз выхаваўчых мерапрыемстваў, якія праводзяцца класным кіраўніком і студэнтамі-практыкантамі. Падрыхтоўка сцэнарыяў і канспектаў мерапрыемстваў, іх рэалізацыя і самастойны аналіз якасці арганізацыі і правядзення. Работа з бацькамі вучняў (індывідуальныя размовы, выступленні на бацькоўскіх сходах і г. д.);

– работа з класам, замацаваным для праходжання практыкі: знаёмства з вучнямі, вывучэнне класнага калектыву і міжасобасных адносінаў; выяўленне індывідуальнага стылю адносінаў педагога да выхаванцаў. Знаёмства з планам выхаваўчай работы класнага кіраўніка;

– удзел у метадычнай рабоце школы (гімназіі, ліцэя, каледжа): выступленне на метадычных нарадах (саветах) настаўнікаў, дапамога ў распрацоўцы метадычных матэрыялаў для кабінетаў; выкананне разам з настаўнікам заданняў метадычнага характару.

У выніку праходжання пераддыпломнай практыкі студэнт павінен:

– замацаваць і ўдасканаліць веды, атрыманыя ў выніку вывучэння лінгвістычных, літаратуразнаўчых і псіхолага-педагагічных дысцыплін;

– авалодаць асноўнымі прафесійнымі ўменнямі настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка.

У выніку праходжання пераддыпломнай практыкі студэнт павінен умець:

– планаваць вучэбна-выхаваўчы працэс;

– правільна выбіраць метады, прыёмы, сродкі і формы навучання ў залежнасці ад мэты ўрока, зместу вывучаемага матэрыялу і ступені падрыхтаванасці навучэнцаў;

– мадэляваць і праводзіць урокі мовы і літаратуры розных тыпаў;

– правільна ацэньваць вынікі вучэбнай дзейнасці школьнікаў;

– ажыццяўляць пазакласную работу па прадмеце, выхаваўчую работу з навучэнцамі, весці псіхолага-педагагічныя назіранні;

– аналізаваць уласную вучэбна-педагагічную дзейнасць;

– у працэсе мэтанакіраванага назірання заўважаць і асэнсоўваць станоўчы вопыт у рабоце настаўніка, каб потым прымяніць яго ў далейшай прафесійнай дзейнасці;

– ажыццяўляць аналіз урокаў мовы і літаратуры з мэтай асэнсавання крытэрыяў іх ацэнкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У працэсе практыкі ажыццяўляецца праверка ўзроўню педагагічнай накіраванасці і прафесійнай прыгоднасці студэнтаў. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі вынікаў пераддыпломнай практыкі з’яўляюцца наступныя:

– ступень сфарміраванасці ў студэнтаў прафесіянальна-педагагічных уменняў па ўжыванні на практыцы спецыяльных і псіхолага-педагагічных ведаў, падрыхтаванасць да іх выкарыстання;

– узровень прафесіянальнай накіраванасці асобы будучага выкладчыка (цікавасць і матывацыя да педагагічнай прафесіі, здольнасць да самарэгуляцыі, самаадукацыі, гатоўнасць да няспыннага прафесійнага самаўдасканалення, выяўленасць такіх прафесійных якасцяў, як любоў да дзяцей, самастойнасць, ініцыятыўнасць, адказныя і творчыя адносіны да работы і інш.).

Пры гэтым улічваюцца наступныя зместавыя кампаненты прафесійна-педагагічнай характарыстыкі выпускніка філалагічнага факультэта:

– сістэма прафесійна-педагагічных ведаў (агульнанавуковыя веды; веды па лінгвістыцы і літаратуразнаўстве; веды па педагогіцы і псіхалогіі);

– сістэма прафесійна-педагагічных уменняў і навыкаў (гнастычных, праекціровачных, канструктыўных, арганізатарскіх, камунікатыўных);

– сістэма сацыякультурных ведаў;

– асобасныя прафесійна значныя якасці настаўніка мовы і літаратуры (шырокая эрудыцыя, свабоднае валоданне культурай вуснага і пісьмовага маўлення, глыбокае разуменне ролі мовы для развіцця мыслення моўнай асобы і ролі літаратуры для фарміравання духоўнага свету чалавека, свабоднае валоданне методыкай выкладання вучэбных прадметаў і інш.).

Улічваючы ўсё адзначанае, двухэтапнае праходжанне практыкі на 4 курсе спрыяе вызначэнню прафесійнай прыгоднасці студэнта – будучага настаўніка беларускай мовы і літаратуры, дае магчымасць зразумець, ці здольны ты працаваць у школе, ці любіш ты дзяцей.

Трэба адзначыць, што большасць студэнтаў, якія прайшлі практыку, адзначаюць, што працаваць з дзецьмі ім падабаецца, што праца настаўніка вельмі складаная і патрабуе грунтоўнай прафесійнай падрыхтоўкі, і выказваюць упэўненасць, што правільна выбралі будучую прафесію.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ